# НА МАРКАХ — МУЗЫЧНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ

**Міністэрства сувязі і інфарматызацыі заўтра выпусціць у абарачэнне дзве паштовыя маркі з серыі «Традыцыйныя музычныя інструменты беларусаў».**

На марках будуць адлюстраваны дуда, якая да сярэдзіны мінулага стагоддзя актыўна выкарыстоўвалася для акампанементу падчас танцаў і правядзення абрадаў, і лютня — старадаўні струнны шчыпковы музычны інструмент.

Дызайн марак распрацавала Яўгенія Бядонік. Яны аддрукаваны тыражом у 40 тысяч экзэмпляраў у вялікім лісце (па восем марак).



Таксама яны выпушчаны і ў малым лісце па чатыры штукі. Тыраж гэтых лістоў складае 20 тысяч.

Праект падрыхтаваны пры садзейнічанні Нацыянальнай бібліятэкі і Дзяржаўнага музея гісторы тэатральнай і музычнай культуры, а таксама майстра Юрыя Дубнавіцкага.

Спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень» адбудзецца 29 жніўня ў мінскім аддзяленні сувязі № 1.

